71.05
К 17

Д 28

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ

УДК 008 (043.3) + 008 (476) (043.3)

Калацэй Вячаслаў Віктаравіч

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАГА СУМЕЖЖА (СТРУКТУРА ПАЗНАННЯ І ПАВОДЗІН)

24.00.01 - тэорыя культуры

Аўтарэферат
дысертацыі на суіскание вучонай ступені
кандыдата культуралогії

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск - 2000

Работа выканана на кафедры сацыялогіі і культуразнаўства Беларускага універсітэта культуры

Навуковы кіраўнік — доктар філасофскіх навук, прафесар Дарашэвіч Э.К.

Афіцыйныя апаненты: доктар філасофскіх навук Конан У.М.
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Крук І.І.

Апаніруючая ўстанова: Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка

Абарона адбудзецца « 14 » верасня 2000 года а « 14[00] » гадзіне на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.02 пры Беларускім універсітэце культуры (220001, г. Мінск, вул.Рабкораўская,17. Тэл. вучонага сакратара 222-80-25 )

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага універсітэта культуры.

Аўтарэферат разасланы « » чэрвеня 2000 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт /Ігнатовіч П.Р./

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Актуальнасць тэмы дысертацыі

Актуальнасць тэмы абумоўлена шэрагам прычын з наступнай групоўкай.

1. Этнаэкалагічныя прычыны. Сёння праявы традыцыйнай культуры Беларусі — набор з'яў, якія павольна знікаюць з ужытку. Гэта пры тым, што дзяржава дэкларуе неабходнасць яе захавання, выдае адпаведныя нарматыўныя акты і выдзяляе сродкі на адукацыю і ўтрыманне спецыялістаў-захавальнікаў. Згодна тэорыі камунікацыі, каб справы не былі даведзены да мяжы знікнення, паміж тымі, хто аналізуе, захоўвае і транслюе традыцыю, павінна існаваць узаемапаразуменне адносна: сэнсу сваіх дзеянняў, камунікацыйных інтэнцый (ператварэння стратэгіі ў практыку), камунікацыйных перспектыў. Пры вялікіх аб'ёмах інфармацыйнага патоку і вузкай прафесійнай спецыялізацыі нашых сучаснікаў гэта магчыма выключна пры звароце не толькі да вонкавых складальнікаў традыцыі, якія магчыма назіраць, але ж і да тых, якія існуюць ненаяўна, на сістэмным, структурным узроўні. Толькі такі зварот здольны спрыяць далейшаму існаванню традыцыі як гаранты самазахавання этнасу.

2. Сцыентысцкія прычыны. Без беларускай часткі «мазаіка» усходнееўрапейскіх культур катастрафічна няпоўная. Сведчанне гэтага—зварот да нашага традыцыйнага матэрыялу сусветнавядомых даследчыкаў з суседніх краін (Казімерас Буга, Марыя Гімбутас, Вячаслаў Іванаў, Уладзімір Тапароў). Беларуская традыцыя таксама аб'ектыўна не можа быць ізалявана ад яе «культурнага наваколля»: без параўнання з суседзямі мы недакладна ведаем сябе. Менавіта таму важна разглядзець уласную культуру *парэгіянальна* ва *ўсходнееўрапейскім* кантэксце. І вырашыць пры гэтым адпаведныя праблемы герменэўтыкі, тэксталогіі, каб быць зразумелымі іншымі і разумець іншых.

3. Сацыяльныя прычыны. Пры сацыяльных прагнозах, якія неабходны для жыццезабеспячэння грамадства, пажадана рэальна ўяўляць яго культурны генезіс. Ігнараванне якога—гарантыя небяспечных наступстваў: сацыяльных канфліктаў і нестабільнасці. Традыцыйная культура і Беларусі, і Літвы мае даволі глыбінную інтэграцыю ў побыт і свядомасць. З пункту гледжання ж сучаснай навукі, ніводная з груп людзей не з'яўляецца занадта шэрай і прымітыўнай, каб яе абмінулі ўвагай у этнасацыяльных даследаваннях.

4. Палітычныя прычыны. Статус дзяржавы для Беларусі сёння—аб'ектыўная рэчаіснасць. Адсюль—неабходнасць: паўнаважкай самаідэнтыфікацыі як нацыі, канцэпцыі этнагенезу, якая па магчымасці пазбаўлена «белых плямаў». Тым больш, што плён і, нават, неабходнасць ў гэтым кантэксце рэгіянальных даследаванняў не раз падкрэслены ў спецыяльнай літаратуры, дзе беларуска-літоўскаму сумежжу* (гісторыка-этнаграфічным рэгёнам: Панямонню, Паазер'ю, паўночнай частцы Цэнтральнай Беларусі, Дзукіі і Аўкштайтыі) часцяком нададзена асаблівая ўвага.

* Пад «беларуска-літоўскім сумежжам» у даследаванні разгледжаны тэрыторыі, якія месцяцца з абодвух бакоў агульнага адрэзку с у ч а с н а й дзяржаўнай мяжы.

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага універсітэта культуры
Інв. №

## Мэта і задачы даследавання

Мэта даследавання: высветліць пытанні генезісу, тыпалогіі і механізмаў самазахавання нематэрыяльнай традыцыйнай культуры сумежжа Беларусі і Літвы, маючы на ўвазе яе каштоўнасць і неабходнасць далейшага існавання.

Задачы: 1. Інтэрпрэтаваць этнаграфічны матэрыял, які назапашаны збіральнікамі ў беларуска-літоўскім сумежжы (у далейшым тэксце можа быць узгадана як «Рэгіён»), у адпаведнасці з сучаснымі дэфініцыямі, тэрміналагічнымі стандартамі шэрагу грамадскіх навук: культуралогіі, сацыякультурнай антрапалогіі, тэорыі камунікацыі.

2. Вызначыць паралельныя (у рознай ступені) з'явы традыцыйных камунікацыі, сацыялізацыі і інкультурацыі беларускай і літоўскай частак Рэгіёну.

3. У паралельных вонкавых культурных праявах акрэсліць іх схаваныя сэнсы, семантыку, якія існуюць ненаяўна, але здольны быць рэстаўраваны.

4. Удакладніць пытанні храналогіі найбольш характэрных з'яў традыцыйнай культуры Рэгіёну.

5. Прапанаваць навукова абгрунтаваныя методыкі рэфлексіі і самарэфлексіі грамадствам уласнай культурнай спадчыны.

## Аб'ект і прадмет даследавання

Аб'ект даследавання: нематэрыяльная традыцыйная культура (як спосабы арганізацыі мыслення і ўзаемадзеяння груп людзей пераважна вясковага асяродку) сумежных тэрыторый Беларусі і Літвы.

Прадмет даследавання: генезіс і механізмы трансляцыі ў часе нематэрыяльнай традыцыйнай культуры беларуска-літоўскага сумежжа.

## Гіпотэза

У мадэлях мыслення і паводзін носьбітаў традыцыйнай культуры беларуска-літоўскага сумежжа сімвалічна транслюецца падобны тэсматычны (каранёвы, уласцівы заснавальнікам традыцыі) пазнавальны генезіс, які зніітаваны і з міграцыйнымі, і з аўтахтоннымі па паходжанню культурнымі тыпамі.

## Метадалогія і метады праведзенага даследавання

У рабоце выкарыстана храналагічна-этнічная метадалогія даследавання фальклору, якая прадугледжвае гістарычнае прачытанне сімволікі дзеяў і абрадаў. Пры рэканструкцыі кагнітыўных (пазнавальных) і паводзінных структур традыцыйнай культуры былі выкарыстаны гісторыка-тыпалагічны і структурна-тыпалагічны метады.

## Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў

1. У фальклорных крыніцах вызначаны фрагменты рэштак этыялагічных тэкстаў, якія тлумачаць паходжанне ўпарадкаванага сусвету (космасу) традыцыі сумежжа. Вызначаюцца магчымыя этнічныя і храналагічныя адрасацыі міфаў.



2 Знойдзены адпаведнасці структуры архаічных міфаў у паводзіннай традыцыі, якая часткова праіснавала дагэтуль. Даследаваныя асаблівасці паводзін вытлумачаны пераважна паходжаннем з акрэсленай сістэмы міфаў Рэгіёну.

3. Культуры беларускай і літоўскай частак сумежжа параўнаны суаднясеннем фрэймаў (мадэляў знешніх параметраў) камунікацыйных актаў.

4. Вызначаны паралельныя (у рознай ступені) культурныя з'явы: ад *далёкага падабенства* (у называнні сваякоў: 'братавая'-'brolienė', 'швагір'-'švogris'; у паводзінах абрадавых комплексаў: Юр'я-Jorė, Спленне-Žolinė) да *прамых аналогій* (валачобны абрад-lalavimas, талака-talkos, масленка- užgavėnės; жніўныя песні-rugiapiutės dainos).

5. Праведзена параўнальнае экспертнае апытанне па сістэмах сваяцтва ў сумежных рэгіёнах Беларусі і Літвы.

6. Выканана сістэматызацыя Рэгіянальных дадзеных па: назвах сваяцтва, параўнанню раннетрадыцыйнай класікі песень; адзнаках сезонных паводзін.

## Практычная і эканамічная значнасці вынікаў

Матэрыялы даследавання здольны быць выкарыстаны ў курсах: культуралогіі, беларусазнаўства, семіётыцы, філасофіі. Вынікі даследавання прыдатны для выкарыстання не толькі культуролагамі, філосафамі, семіётыкамі, але ж і этнолагамі, фалькларыстамі, этнамузыколагамі, этнахарэографамі ў навуковай, вучэбнай і практычнай рабоце, якая зніітавана з даследаваннем традыцыйнай культуры ў аўтэнтычных умовах.

## Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону

1 Традыцыйная нематэрыяльная культура беларуска-літоўскага сумежжа здольна быць вытлумачана і прааналізавана ў рэчышчы групы культуралагічных дысцыплін як *сістэма агульнапрынятых ў традыцыйным асяродку Рэгіёну спосабаў арганізацыі мыслення (пазнання) і паводзін*.

2. У генезіс культуры пазнання заснавальнікаў традыцыі сумежжа, пачынаючы з палеаеўрапейскіх часоў, ўвайшлі па-рознаму этнічна абумоўленыя астральныя, касмаганічныя, антрапаганічныя, тэаганічныя міфы, міфы пра культурных герояў.

3. Адпаведнасці рэканструкцыям міфаў Рэгіёну магчыма акрэсліць не толькі ў фальклорных *вербальных тэкстах*, дзе рэшткі міфаў праіснавалі амаль дагэтуль, але ж і ў *мадэлях паводзіннай традыцыйнай культуры*.

4. Паводзінная традыцыя, такім чынам, набывае статус *сістэмы сімвалаў*, якія выкарыстаны дзеля перадачы інфармацыі пра яе кагнітыўны, пазнавальны генезіс.

5. Побач з эмпліцытнымі (*вонкавымі, якія магчыма перцэптыўна ўспрыняць*) з'явамі і сэнсамі ў традыцыйнай культуры існуюць імпліцытныя (*схаваныя, якія магчыма дэшыфраваць, толькі ведаючы пэўныя коды*) сэнсавыя структуры, якія бяруць вытокі ў культуры пазнання яе заснавальнікаў.

6. Існуючае *падабенства мадэляў паводзін* носьбітаў традыцыйнай культуры па абодвы бакі мяжы сведчыць пра першапачатковае *падабенства пазнавальных структур* лакальных традыцый, якое магчыма адсачыць нават пасля аб'ектыўна-гістарычна абумоўленых змен у культуры (моўных, палітычных, ідэалагічных).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Апрабацыя вынікаў дысертацыі

Асноўныя вынікі работы былі апрабіраваны на наступных навуковых канферэнцыях: «Культура беларуска-польска-літоўскага сумежжа» (Міжнародная навуковая канферэнцыя, Гродна, 1997), «Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у сістэме ВНУ» (Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя, Мінск, 1997), «Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі» (Навуковая канферэнцыя аспірантаў БУК, Мінск, 1997), «Социокультурные и эстетические основы творчества детей и подростков» (Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, Мінск,1998).

Тэарэтычныя звесткі, якія атрыманы ў працэсе даследавання, выкарыстаны пры вызначэнні прыярытэтных кірункаў і арганізацыі практычнай работы лабараторыі фальклору Нацыянальнага Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Рэспублікі Беларусь.

Пэўныя палажэнні дысертацыі ўключаны ў цыкл лекцый «Беларуская народная песенна-харавая творчасць», які быў прачытаны на факультэце завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры ў 1999/2000 навучальным годзе.

### Публікацыі

Па тэме дысертацыі апублікаваны 7 артыкулаў, сярод якіх: 2—у інфармацыйна-навуковым і навукова-метадычным часопісах; 2—у рэпертуарных зборніках; 3 тэзісы дакладаў—у матэрыялах навуковых канферэнцый.

### Структура і аб'ём дысертацыі

Работа складзена з пераліку ўмоўных скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі, двух глаў, заключэння, спіса літаратуры. Агульны аб'ём дысертацыйнага даследавання—102 старонкі. Дысертацыя мае : 23 табліцы і 3 малюнкі. Спіс літаратуры ўключае 130 назваў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** раскрыта важнасць напісання дысертацыі на тэму «Традыцыйная культура беларуска-літоўскага сумежжа (структура пазнання і паводзін)». Паказана, што без аналізу традыцыі на ўзроўні яе сэнсавых, кагнітыўных структур у сучасных умовах яе не захаваць. Сфармуляваны асноўныя праблемы, якія паўстаюць перад даследчыкамі традыцыі, а таксама прынцыпы іх вырашэння. Разгледжаны прычыны выкарыстання дадзенай метадычнай базы даследавання.

**У агульнай характарыстыцы работы** абгрунтавана актуальнасць тэмы, вызначаны мэта і задачы, а таксама аб'ект і прадмет даследавання, сфармуляваны палажэнні, якія вынесены на абарону, асветлена навуковая навізна вынікаў, якія былі атрыманы, а таксама абгрунтавана іх практычная значнасць.

**Першая глава** «Традыцыйная культура пазнання беларуска-літоўскага сумежжа» прысвечана *спосабам арганізацыі мыслення*, характэрным носьбітам культуры традыцыйных супольнасцяў сумежжа. У ёй разгледжаны асаблівасці генезісу, існавання, структурнага



афармлення тэсматычных уяўленняў, якія ўтвараюць аснову традыцыі. Тэсматычныя элементы культуры—каранёвыя, якія не падпарадкаваны інавацыям, прайшлі выпрабаванне часам, уласцівы заснавальнікам традыцыі. Без іх акрэслівання і апрацоўкі-рэфлексіі немагчыма вызначыць *імпліцытныя*, якія носьбіты традыцыі часцяком не ўяўляюць, сэнсы зафіксаваных этнографамі і фалькларыстамі паводзінных праяў. Гэтыя сэнсы—своеасаблівы «гай», якога мы часцяком не бачым за «дрэвамі»—знешнімі, перцэптыўна адчуваемымі культурнымі праявамі. Самі па сабе паводзінныя праявы традыцыйнай культуры (наборы камунікацыйных актаў зносін—перадачы інфармацыі,—якія групуюцца ў выглядзе гульняў, танцаў, абрадаў, сямейна-сваяцкіх і грамадскіх дачыненняў) зафіксаваны досыць падрабязна. Аднак іх кагнітыўным караням—уяўленням, дзякуючы якім знешнія праявы з'явіліся, набылі менавіта такую, а не іншую форму, да апошніх часоў надавалася значна менш увагі.

**У першым раздзеле** «Рэгіянальная міфалогія» зроблены аналіз найбольш архаічнага пласта ўяўленняў—міфалагічнага. Падкрэслена, што міф з'яўляецца праявай светаадчування, якому магчыма надаць якую заўгодна па разнастайнасці форму: ад вербальнага тэксту-аповяду да песні, дзеі, танца і г.д. Зыходзячы з гэтага, на падмурку аналізу тэкстаў-*аповядаў* (паданняў, казак, замоў) і тэкстаў-*дзеяў* (абраднасці, гульняў) Рэгіёну, фрагменты міфалагічных сюжэтаў разведзены ў сістэматызаваныя групы. Згодна класіфікацыі маскоўскіх даследчыкаў С.А.Токарава і Е.М.Мелацінскага ў **§ 1.1.1.** «Міфы рэгіёну». Сярод мясцовых этнаграфічных матэрыялаў назіраюцца міфы, якія магчыма ідэнтыфікаваць як: *астральныя, касмаганічныя, антрапаганічныя, тэаганічныя, эсхаталагічныя, міфы пра культурных герояў.* Аналіз структуры міфалогіі сумежжа выяўляе храналагічную і культурную неаднароднасць, розныя вытокі адпаведных ўяўленняў. Каб упарадкаваць этыялагічныя звесткі з дапамогай гісторыка-тыпалагічнага метаду, зроблены зварот да гісторыі культуры Рэгіёну, яе асноўных перыядаў: *даіндаеўрапейскага, балтыйскага, славянскага*. Аналіз перыядаў даведзены да храналагічнай мяжы фарміравання беларускай народнасці—XIV ст. Да гэтага часу на гістарычнай арэне Рэгіёну збольшага ўжо адзначыліся прадстаўнікі ўсіх этнасаў, якія ўтварылі складальнікі этнагенезу літоўцаў і беларусаў. Адпаведна і ў падмурак культуры Рэгіёну былі закладзены асноўныя кампаненты архаічнай тэсматычнай, міфалагічнай часткі яго традыцыйнай культуры. Міфалагічныя ўяўленні ў напалову зашыфраваным выглядзе працягваюць існаваць ў традыцыйнай абраднасці мясцовага насельніцтва. Так, імпліцытныя карані велікоднай абраднасці Рэгіёну (Блавешчання-Pavasario lygė, Вялікдня-Velykos) магчыма шукаць у даіндаеўрапейскіх *астральна-касмаганічных* міфах, якія звязаныя з сакралізацыяй вадаплаваючай птушкі і яе яйка. Абраднасць Купалля-Kupoliu švente мае моцны індаеўрапейскі *антрапаганічны* кантэкст. Да спадчыны індаеўрапейцаў магчыма дапасаваць таксама асобныя элементы *касмаганічных* (стварэнне асобных элементаў рэчаіснасці адмоўным антыподам дэміурга —velnias, чорт, Анцыпар—уяўленняў, рэшткі «асноўнага міфа» індаеўрапейскай міфалогіі пра адзінаборства грамавіка Пяруна-Perkūnas'а са сваім хтанічным па паходжанню ворагам Змеем-Цмокам-Vėlnias'ам), *тэаганічных* (пэўны тэалагічны дуалізм у традыцыйнай свядомасці) уяўленняў. Як індаеўрапейскія па паходжанню магчыма вытлумачыць адмысловыя асаблівасці традыцыйных грамадскіх дачыненняў у галінах сям'і і супольнасці. Напрыклад, комплекс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уяўленняў і адпаведныя паводзінныя праявы, знітаваныя з бінарнай апазіцыяй «свой-чужы»: беларускае 'вёска' і літоўскае 'viešpatis'-«гаспадар» ў параўнанні з авестыйскім 'vis'-«род» і лацінскім 'vicus'-«вёска»; баладны топік (сюжэт) «чужаземчыю».

Такім чынам акрэслена прыкладнае кола этыялагічных апавядаў, якія некалі, магчыма, утварылі падмурак светаўспрымання заснавальнікаў традыцыі сумежжа. Інакш кажучы, рабілі пэўную арганізацыю, структураванне іх свядомасці.

**§ 1.1.2.** «Функцыі міфалогіі» аналізуе і тлумачыць першапачатковы функцыянальны бок міфалагічных структур Рэгіёну. Этнаграфічныя матэрыялы і даследаванні культуролагаў дазваляюць акрэсліць дзве падгрупы функцый міфалогіі: магічныя і кансерватыўныя функцыі. Да магічных (паводле Ул.Тапарова і С.Санько) магчыма далучыць *антыэнтрапічную* (мяркуемая рытуальная барацьба з тэндэнцыямі «зношвання» свету з дапамогаю каляндарных абрадаў, імпліцытны сэнс якіх — зварот да сакральных касмалагічных падзей) і *рэгулятыўную* (падтрыманне належнай касмалагічнай раўнавагі ў прыродным асяродку з дапамогай сакральнага абазначэння прасторы). Як камунікатыўныя функцыі магчыма вызначыць (згодна М.Говарда): *кансерватыўную* (замацаванне ў свядомасці пэўных сацыяльных каштоўнасцяў: павагі да бацькоў, правілаў узаемадачыненняў палоў), *сацыяльную* (асвячэнне існуючых інстытутаў улады).

Такім чынам вызначаны набор праблем, якія на этапе т.зв. міфапаэтычнага існавання традыцыі абавязкова патрабавалі перыядычнага вырашэння з боку супольнасцяў яе носьбітаў, каб «упісаць» іх ў космас, забяспечыць псіхалагічны і фізічны камфорт. Як бачым, структура міфаў, якая была акрэслена першапачаткова, далей мела непасрэднае дачыненне да адаптацыйнай стратэгіі навукова зафіксаванай традыцыі.

У **§ 1.1.3.** «Міфалогія рэгіёну як сістэма знакаў» акрэслена, што здзяйсненне функцый падтрымкі прыроднай і сацыяльнай раўнавагі ладзіцца з дапамогаю пэўных сродкаў. Сродкамі тут паўстаюць абрады і рытуалы, якія ў свой час актыўна садзейнічалі задавальненню «космаадаптацыйных» патрэб супольнасці.

На ўзроўні мыслення функцыянальнаму задавальненню патрэб жыцця папярэднічае уяўленне пра «механізм» гэтага задавальнення. Адпаведныя праявы магчыма рэпрызентаваць у выглядзе ўяўленняў пра фрэймы традыцыйных абрадаў і рытуалаў. Фрэймы (згодна тэорыі маўленчай камунікацыі) — *пакункі інфармацыі, якія знітаваны з уяўленнямі пра знешнія параметры пэўнай сітуацыі*.

Калі суаднесці здабытыя рэканструкцыі касмалагічных сэнсаў асноўных рытуалаў і ўмовы іх блізкага да нас жыццёвага існавання, заўважна, што тэсматычныя сэнсы, якія тлумачаць рытуальныя паводзіны, даўно не ўяўляюцца, страчаны. Але ж запраграмавана працягваюць існаваць імпліцытна.

Такая спецыфіка абрадавых праяў дае падставу трактаваць рытуалы як сімвалы—*знакі з адвольным значэннем*. Значэнне ў дадзеным выпадку (на касмалагічна адрасаваным узроўні) дэтэрмінавана міфалогіяй. Таму Рэгіянальную міфалогію, якая задавальняе свае функцыі з дапамогай рытуалаў-сімвалаў, магчыма рэпрызентаваць як знакавую сістэму. Традыцыйная культура Рэгіёну захавала ўяўленні пра паводзінныя мадэлі, з дапамогаю якіх у свой час сімвалічна афармляліся міфалагічныя сэнсы. Таму яе (у рэчышчы сімвалічнай антрапалогіі і структурна-тыпалагічнага метаду) правамочна



разглядаць як *мадэлі мыслення і паводзін, якія транслююць пэўную інфармацыю*. Як пазначалі Леў Гумілёў, лінгвісты-структуралісты Вячаслаў Іванаў і Уладзімір Тапароў і, у дачыненні да беларускай культуры, Сяргей Санько, своеасаблівая інфармацыйная квінтэсэнцыя культуры, яе «парад знакавых сістэм», «супертэкст»—каляндар. Пры пабудове адпаведных схем заўважна, што носьбіты традыцыі Рэгіёну па абодвы бакі мяжы амаль аднолькава «фрэймавалі» гэты супертэкст. Гэта магчыма разглядаць як доказ таго, што ў пазнавальным генезісе мясцовых культур у свой час былі закладзены падобныя касмалагічныя сэнсы. Іншымі словамі—адзіны міфалагічны код, які дазваляе ператвараць інфармацыю паводзінных праяў у расшыфраваныя знакі, якія магчыма зразумець.

Як бачым, гіпатэтычна Рэгіянальная міфалогія—эфектыўная самадастатковая з'ява са сродкамі дзеля трансляцыі ўласцівых ёй структурных пабудоў скрозь час.

У **другім раздзеле** першай главы «Рэлігіі сумежжа» з дапамогай гісторыка-тыпалагічнага метаду разгледжаны элементы, якія некалі пакінула ў пазнанні культавая сістэматызацыя ўяўленняў (рэлігія) у часы *паганства*—**§ 1.2.1.** «Мясцовыя рэшткі паганства»: сістэмнасць рэлігійных цырымоніяў, інстытут прафесійнага святарства, індаеўрапейская трыяда вярхоўных бостваў— і *манатэізма*—**§ 1.2.2.** «Хрысціянства і этнічная культура»: культ Хрыста, своеасаблівая інтэрпрэтацыя ідэі адвечнага жыцця, хрысціянская рэгламентацыя аддзялення сакральнага ад секулярнага.

**§ 1.2.3.** «Рэлігія і адаптацыйная стратэгія носьбітаў рэгіянальнай традыцыі» прысвечаны суаднясенню дадзеных пра *светаўспрыманне* носьбітаў мясцовай традыцыі з класіфікацыяй культаў Энтані Ўэлеса. На гэтай падставе відавочна, што найбольш значныя адбіткі на традыцыйную культуру пазнання Рэгіёну наклалі такія формы культавай арганізацыі свядомасці, як *абшчынная рэлігія* (агульнаграмадскія рытуалы земляробчага календара) і *манатэізм* (культ Хрыста), пры частковай прысутнасці адбіткаў шаманскай (інстытут знахарства) і алімпійскай (лінгвістычныя звесткі з коранем 'пяр'- 'per', 'вел' - 'vel').

У **трэцім раздзеле** «Традыцыйная свядомасць» дадзены пра культуру пазнання, якія раней разгледжаны збольшага гісторыка-тыпалагічна, прааналізаваны і з дапамогай структурна-тыпалагічнага метаду.

Дадзеныя пра міфалагічнае светаўспрыманне сістэматызаваны ў **§ 1.3.1.** «Архаічныя складальнікі свядомасці» на падставе акрэслівання ў фальклорных крыніцах такіх яго форм, як *аніматызм, анімізм, татэмізм*, уяўленні пра *рэінкарнацыю* і пра *звышнатуральныя істоты*. Яны цалкам знаходзяцца ў структурных рамках, якія задаюць мясцовыя групы міфаў.

Форма культа, якая найбольш моцна паўплывала на традыцыйную свядомасць, — хрысціянства. Таму асаблівасці *культавых уяўленняў* носьбітаў Рэгіянальнай традыцыі, якія накладаліся на міфалогію, прааналізаваны ў **§ 1.3.2.** «Рэлігійныя складальнікі свядомасці» з пункту гледжання *супадзення з асноўнымі дагматамі хрысціянства*. Дадзеныя фальклорных крыніц суаднесены з такімі з іх, як Абсалютнасць Бога, Трыадзінства, Богаўвасабленне, таксама з асаблівасцямі ўяўленняў пра адэптаў Бога і з т.зв. «містычным гістарызмам» хрысціянства. У праявах мясцовай традыцыйнай культавай свядомасці вызначана дакладнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фанаванне рысаў хрысціянскай міфалогіі (згодна С.Аверынцава), адрозных ад дагматаў артадаксальнага хрысціянства. Што дазваляе рабіць выснову пра храналагічную ўстойлівасць *міфалагічнай* структураванасці традыцыйнай культуры пазнання сумежжа.

Дадзеныя адносна структурнага афармлення асаблівасцяў традыцыйнай свядомасці магчыма пэўным чынам параўнаць. Калі іх тыпалагічна суаднесці са структурай Рэгіянальнай міфалогіі, заўважны дамінуючы ўплыў мясцовых міфаў на пазнейшыя формы традыцыйнага светаўспрымання. Апошнія шмат у чым так і не здолелі (не мелі патрэбы) выйсці за межы, якія акрэсліла міфалогія. Структурна аналізаваць дадзеныя адносна традыцыйнай свядомасці, такім чынам, магчыма з дапамогай навуковага інструментарыя даследчыкаў міфалогіі. Такія дадзеныя найбольш поўна і аптымальна здольны быць рэпрызентаваны ў шасці параметрах (згодна Ул.Тапарову). Такая апрацоўка ў выглядзе табліцы выканана ў **§ 1.3.3.** «Структура традыцыйнага пазнання». У такім стане структура свядомасці, светаўспрымання паўстае як звесткі пра мадэль свету (МС) традыцыйнай культуры Рэгіёну. Альбо (згодна тэарэтыку маўленчай камунікацыі Я.Клюеву) як звесткі пра пэўны набор прэсупазіцый мясцовай традыцыйнай камунікацыі—надзвычай глыбокіх ўяўленняў пра родавыя і структурныя асаблівасці прадметнага свету, якія характэрны для культуры. Прэсупазіцыі камунікацыі абавязкова ўваходзяць ў сістэму складальнікаў паўсядзённых зносін носьбітаў культуры.

Пры далейшай апрацоўцы дадзеных пра культуру пазнання ў сістэме міфалагічнай МС Рэгіёну вызначаны асноўныя асаблівасці яе арганізацыі, унутрысістэмныя сувязі. Сярод іх—тэтрада аператараў МС (уяўленні пра чатыры абавязковыя стадыі: *узнікненне, павелічэнне, памяншэнне і знікненне*, з якімі носьбіты культуры падсвядома суадносяць заканамернасці большасці жыццёвых працэсаў).

Варыятыўныя ланцугі вобразаў кшталту: «вада - камень - кветка - зязюля» у загадках вялікоднага рытуалу сумежжа здольны мець тлумачэнне *канцэптуальных матрыц* (па вызначэнню Ул.Тапарова), з дапамогай якіх універсальна-сімвалічна апісваўся *касмалагічны парадак* міфапаэтычнай традыцыі: «касмалагічны цыкл, рэлігійна-філасофскія канцэпцыі і сам працэс пазнання». У такіх тэкстах, магчыма, задаецца набор аператараў над першаэлементамі-класіфікатарамі мясцовай МС.

Сюды ж дапасаваны (згодна Л.Неўскай, С.Санько, Я.Чурлянітэ) наступныя прыкметы асобных параметраў МС: *цыклічнасць* і *ізамарфізм* тэмпаральных структур; прынцыповая *пачатковасць* і *канечнасць* традыцыйнага космасу; *сакральнасць лічбаў* 3,7,9; акцэнтацыя *бінарнай апазіцыі* «свой—чужы».

Як акрэсленыя рысы культуры пазнання канкрэтна ўплываюць на Рэгіянальную культуру паводзін, разглядаецца ў другой главе «Традыцыйная культура паводзін беларуска-літоўскага сумежжа».

У **першым раздзеле** «Камунікацыя носьбітаў традыцыйнай культуры» разгледжаны формы жыццёванеабходнага дзеля супольнасцяў усіх тыпаў абмену інфармацыяй і іх праявы ў традыцыі сумежжа. Даведзена, што формы традыцыйнай камунікацыі згрунтаваны на знаках (матэрыяльны аб'ект, які замяняе сабой тое, што трэба паведаміць) і *сімвалах* (знаках



з адвольным значэннем, якое абумоўлена грамадскімі нормамі і навучаннем). Разгледжана, якім чынам пэўныя формы камунікацыі здольны паходзіць з асаблівасцяў традыцыйнай МС сумежжа. Так, прасторава-часавы параметр МС, у якім сканцэнтраваны асноўныя касмалагічныя ўяўленні, дыктуе адпаведныя рытуальныя дзеі-сімвалы. Асобна разгледжаны напевы-знакі-сімвалы (раннетрадыцыйная класіка песень), як адны з найбольш храналагічна-устойлівых частак папярэдніх. З дапамогаю такіх дзеяў і напеваў носьбіты традыцыі, часам не да канца асэнсавана, імкнуліся зносіцца з космасам, уплываць на сусвет, падтрымліваць касмалагічны парадак. Лічбавы параметр МС суаднесены з тэкстамі і паводзінамі, якія магчыма трактаваць, як наступствы уяўленняў пра колькасці-знакі. Персанажны і семантычны параметр—з узорамі *вербальнай* (маўленчыя сімвалы) і *невербальнай* (дзеі-сімвалы і рэчы-сімвалы) камунікацыі.

У формах традыцыйнай камунікацыі беларускай і літоўскай частак Рэгіёну акрэслена падабенства, якое цяжка растлумачыць выпадковымі запазычваннямі.

У тэорыі камунікацыі пад адрасацыяй камунікацыйных актаў разумеюць *скіраванасць* камунікацыйных форм на пэўны аб'ект камунікацыі: адрасат. У **§ 2.1.2.** «Традыцыйныя адрасаты і адрасанты», з гэтага пункту гледжання, асвятляюцца не толькі зносіны паміж людзьмі, але ж і тыповыя дзеля традыцыйнай свядомасці кантакты з прыродай. Пад узоры такіх зносінаў падпадаюць: вербальныя звароты да персаніфікаванай прыроды (ветра-vejelis, сонейка-saule, Дунаю-Dunojelis, ночанькі-naktele); мяркуемая камунікацыя з памерлымі (запрашэнні, провады, галашэнні, замовы); касмічна скіраваныя абрады. Гэтыя праявы магчыма тлумачыць як рэалізацыі адпаведных фрэймаў паводзін, абумоўленых прэсупазіцыямі камунікацыі, якія закладзены ва ўяўленнях, убудаваных у традыцыйную МС. Так падобныя па структуры беларускія і літоўскія галашэнні (па высновах спецыялістаў—прыклады «некалі адзінага тэксту, які зараз функцыяніруе ў розных моўных увасабленнях») фактычна прызначаны прасторава-часавым параметрам МС для размяжоўвання сфераў жыцця і смерці, светаў жывых і памерлых. Што дазваляе меркаваць існаванне ў адпаведнай мадэлі «некалькіх негамагенных светаў, якія часам прыходзяць у сутыкненне», як сцвярджае С.Санько. Магчыма сцвярджаць наяўнасць *магічнасці* і *касмічнай адрасаванасці* камунікацыйных актаў традыцыі; прапанаваць адмысловую тыпалогію бакоў камунікацыі ў традыцыйнай культуры Рэгіёну, якая фактычна страчана сучаснай урбанізаванай культурай.

Сярод асаблівасцяў традыцыйнай камунікацыі, акрэсленых у **§ 2.1.3.** «Мадальнасць традыцыйнай камунікацыі», у **§ 2.1.4.** «Канвенцыі традыцыйнай камунікацыі» і ў **§ 2.1.5.** «Рэалізацыя характэрных тэмпаральна абумоўленых фрэймаў паводзін сумежжа», разгледжаны, адпаведна, яе *мадальнасць*, *канвенцыі* і асаблівасці *рэалізацыі фрэймаў паводзін каляндарна-абрадавых комплексаў*.

Асаблівасці мадальнасці (адносіны да таго, што сцвярджаеш), традыцыйнай камунікацыі Рэгіёну шмат у чым абумовілі існаванне такіх *фальклорных жанраў*, як замова, праклён; *магічных дзеянняў*—заломаў, абворванняў; *нормаў этыкету*. Мадальнасць—праява прычыннага і этычнага параметраў мясцовай МС, якія дапускаюць магчымасць

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*касмалагізацыі* света *словам*, прадуктыўнасць *магіі*, рэгулюючь *вызваленне ірацыянальнага* ў псіхіцы. Сярод з'яў, якія магчыма трактаваць, як падобныя па абодвы бакі мяжы наступствы *карэкцыі мадальнасці*: асаблівасці форм традыцыйнага мастацтва, характар ужывання алкаголю.

Разгледжаны камунікацыйныя к а н в е н ц ы і (*формы* ўзаемадзеяння, якія рэгламентуе грамадства) Рэгіёну. Яны вызначаны, найперш за ўсё, выбарам *пазіцыі* (слухача, суразмоўцы, крытыка) у адносінах да пачынальніка камунікацыйнага акта. І ўсталёўваюць межы грамадскага ўзаемадзеяння, якія амаль аднолькава маркіраваны ў біэтнічнай Рэгіянальнай традыцыі: ад гіпертрафаванага *індывідуалізму* да суседскіх *талок - talkos*.

«Жывы» вынік сістэмна-структурных асаблівасцяў камунікацыі—*знешняя форма* (ф р э й м) *камунікацыйнага акта*—«адзінкі» паводзін. Інакш—яго агульнапрынятая м а д э л ь, фактычна, *адзінка-складальнік* культуры. Як памятаем, квінтэсэнцыяй культуры з'яўляецца к а л я н д а р, які магчыма рэпрызентаваць як н а б о р м а д э л я ў п а в о д з і н, якія абумоўлены прасторава-часавым параметрам МС. Пры *культурна-антрапалагічным* і *семіятычным* (згодна Юрыю Лотману) падыходзе да культуры менавіта фрэймы камунікацыйных актаў традыцыйнага календара паўстаюць у якасці з'яў, якія магчыма разглядаць як яе с і м в а л ы. К у л ь т у р а, як і н ф а р м а ц ы я, якая назапашана супольнасцю, транслюецца менавіта з дапамогай гэтых сімвалаў. Кодам, які дае магчымасць наблізіцца да разумення іх *сэнсаў*, паўстае структура міфаў Рэгіёну. Доказам гэтага сцвярджэння з'яўляецца тое, што «жывыя» і дакументальныя традыцыйныя матэрыялы па абодвы бакі мяжы сведчаць пра досыць паспяхова захаваныя імпліцытныя сувязі паміж пэўнымі з'явамі-сімваламі культуры, іх астральнай прымеркаванасцю; міфамі Рэгіёну.

| Міфалагічны код | Астральнасць | С і м в а л ы к у л ь т у р ы | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | паводзінныя | прадметныя | вербальныя | музычныя |
| з'яўленне свету з птушынага яйка | веснавое раўнадзенства | гульні-біткі; | лялечныя птушкі; яйкі-маляванкі; | зачыны валачобных песень пра 'птушку-жолуд - дуб'; | валачобныя песні; |
| інцэст блізнятаў-першапродкаў | летні сонцаварот | пошук, збіранне раслін; | кветка; агонь і вада; | балады 'браткі' і 'удава і сыны-карабельнікі'; | купальскія балады; |
| зоаморфныя татэмы, татэмы продкаў | восеньскае раўнадзенства | увага да тубыльцаў хтанічнага свету; | зямля; агонь; | балада 'ваўкі-сваты'; міфалагічны топік 'валадарка вужоў'; | восеньскія песні; |
| канфлікт стануўчага і адмоўнага касмічных пачаткаў | зімовы сонцаварот | гульні з матывамі цмока; | | балады 'юр'я і цмок'; тэксты 'япчур', 'цярэшка'; | піліпаўскія балады; гульнёвыя напевы. |

У выніку маем выснову, што падобныя ў беларусаў і літоўцаў асноўныя этнавызначальныя формы і асаблівасці традыцыйнай камунікацыі—с і м в а л ы для трансляцыі шмат ў чым аднолькавай імпліцытнай касмалагічнай інфармацыі.



**Другі раздзел** «Рэгіянальная сацыялізацыя і інкультурацыя ў сістэме тэтрады апаратараў мадэлі свету» прысвечаны мясцовым асаблівасцям працэсаў с а ц ы я л і з а ц ы і (засваення ад іншых культурных роляў) і і н к у л ь т у р а ц ы і (знаходжання сваіх роляў у грамадстве і засваення культурных каштоўнасцяў).

Асаблівасці пачатку праходжання індывідам (які прайшоў першую стадыю-апаратар: *узнікненне*) праз абазначаныя сістэмай ініцыяцый (па пэўных параметрах падобных у беларусаў і літоўцаў) асноўныя кропкі жыцця, асвечаны ў **§2.2.1.** «Нараджэнне як «узнікненне». Яны спрыяюць фарміраванню такіх рысаў ментальнасці, як талерантнасць, канфармізм, татальная падпарадкаванасць бацькам, адносна высокі статус жанчын у традыцыйных супольнасцях Паазер'я і Панямоння.

Адзнакі, якія звычайна накладалі на асобу імпліцытныя ўяўленні пра наступныя апаратары МС — пераважна арганічнае ўваходжанне ў гаспадарчую і сямейную сферу, — тлумачацца вынікам традыцыйнага сбалансавання фармальнай і нефармальнай адукацыі ў **§2.2.2.** «Сталенне як «павелічэнне» і **§ 2.2.3.** «Сталасць як «памяншэнне». Асветлены асаблівасці вызначанай як *комплексная* сістэмы шлюбнага абмену Рэгіёну. Рознабакова разгледжаны «золак» жыццёвага цыклу—шлюб (з акрэсліваннем, акрамя структурных, шматлікіх паралеляў тыпу: зборная субота-subatos vakarelis; намітка-nuometas, сваха-cvočia), які ў традыцыйнай культуры меў вельмі адрозны ад сучасна-урбаністычнага сэнс. Прынамсі, надзвычай моцна акцэнтавалася яго адаптацыйнасць. Мінімальна бралiся да ўвагі звыклыя нам асабістыя сімпатыі і антыпатыі. Адпаведныя ўяўленні знаходзілі адлюстраванне ў паводзінах, якія цяжка вытлумачыць як натуральныя з пункту гледжання сённяшняй культуры. Разгледжаны наступствы адваротных тэндэнцый (павольнага імкнення да знікнення), пад якія (на імпліцытным узроўні асэнсавання) трапляе рух жыцця пасля шлюбу. Кансервацыя мыслення, побыту, якая абумоўлена трывалым замацоўваннем каштоўнасцей, няздольна спыніць гэтыя тэндэнцыі, але ж здольна надаць ім своеасаблівую лагічнасць, бесканфліктнасць, упісанасць у соцыум. Яе арганічна дапаўняе гнуткасць традыцыі да неабходнасці сацыялізацыі ў сталым узросце (інстытут дзядоў і жабракоў).

Яскравым доказам рэлевантнасці прыкладання тэтрады апаратараў міфапаэтычнай МС да працэсаў сацыялізацыі і інкультурацыі носьбітаў традыцыйнай культуры Рэгіёну магчыма лічыць асаблівасці існавання носьбітаў у «полі ўплыву» апошняга апаратара—**§2.2.4.** «Смерць як «знікненне». Узоры адсутнасці страху смерці, да якой рыхтаваліся загадзя, тлумачацца імпліцытным суаднясеннем жыццёвага цыклу з структурамі мясцовай культуры пазнання.

Такім чынам, і ў з'явах, якія маркіруюць традыцыйную сацыялізацыю і інкультурацыю, магчыма адсачыць інфармацыю пра міфалагічныя структуры Рэгіянальнага пазнання.

**У трэцім раздзеле** «Традыцыйныя сваяцтва і пераемнасць беларуска-літоўскага сумежжа» другой главы разгледжаны гіпатэтычныя вынікі ўплыву пазнавальнага генезісу на рысы мясцовых сваяцтва і пераемнасці. Апошнія лічаць аднымі з галоўных адзнак, якія вызначаюць тыпалогію культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры разглядапні ў § 2.3.1. «Прынцыпы пераемнасці сумежжа» асаблівасцяў мясцовых спадкаемства і ўнутрысямейных дачыненняў магчыма зрабіць выснову, што сёння для Рэгіёну характэрна кагнатычная пераемнасць—усе родзічы і з боку бацькі, і з боку маці—сваякі. Аднак, магчыма меркаваць, што ў гістарычнай мінуўшчыне, якая зыходзіць каранямі (як мінімум) да балтыйскага этапу гісторыі сумежжа, акцэнтавалася патрылінейнасць, маці ўспрымалася, галоўным чынам, як парадзіха, з яе 'радзінай' дзеці амаль не мелі сувязяў.

У традыцыйным сваяцтве, якое разгледжана ў § 2.3.2. «Рэгіянальныя сістэмы сваяцтва», асноўны ўціск гістарычна робіцца на сям'ю «біялагічных» бацькоў. Статус «сацыяльных» бацькоў знаходзіў увасабленне ў інстытуце прымацтва. Рэшткі акцэнтаванасці ў сістэмах называння сваякоў пераважна *патрылінейнай* пераемнасці, магчыма разглядаць, як увасабленне ў пазнанаваўчай і паводзіннай культуры адбіткаў дуальнай родавай арганізацыі і апазіцыі «свой—чужы», як адной з мацнейшых кагнітыўных канструкцый у беларускай і літоўскай культуры. Доказ гэтага—паралелі тыпу: братавая-brolienė; жонка-žmona. Згодна графічнай апрацоўцы сістэм называння сваякоў, магчыма зрабіць выснову, што ў Рэгіёне пануе сістэма сваяцтва, вядомая як *эскімоская*. Што з'яўляецца тыповым дзеля Еўропы і вымагае шэраг храналагічных супастаўленняў.

Пры даследаванні ў § 2.3.2. «Сваяцкія групы сумежжа» сваяцкіх груп, іх па абодвы бакі мяжы магчыма вызначыць, як *эгаскіраваныя*. У галіне традыцыйнага *права спадкаемства* асаблівасці прымацтва магчыма лічыць сведчаннем большай архаічнасці традыцыйнага спадкаемства беларусаў у параўнанні з літоўцамі, дзе, як і ў латышоў, панаваў «патрыярхальны маярат».

Такія праявы паводзіннай культуры Рэгіёну, як сваяцтва і пераемнасць, здольны мець тлумачэнне інфармацыі пра архаічны сацыяльны парадак, у якім знаходзіла адлюстраванне поліэтнічнасць мясцовай культуры.



## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Вывады, якія зроблены па рабоце, складаюцца з наступнага.

1. У якасці знакаў-сімвалаў, прыстасаваных дзеля перадачы інфармацыі пра найбольш архаічныя этыялагічна-міфалагічныя складальнікі традыцыйнай пазнавальный культуры беларуска-літоўскага сумежжа, правамочна разглядаць розныя элементы наступных мадэляў паводзін /3,10/:

| Імпліцытныя складальнікі пазнання з матывамі: | Адпаведныя эмпліцытныя мадэлі | |
|---|---|---|
| | фрэймы паводзін беларускіх абрадавых комплексаў | фрэймы паводзін літоўскіх абрадавых комплексаў |
| касмаганічнасці | Благавешчанне<br>Вялікдзень | Pavasario ligė<br>Velykos |
| антрапаганічнасці і культуртрэгерства (блізняцтва) | Купалле | Kupolių šventė |
| татэмаў продкаў, хтанічнасці | Багач<br>восеньскія Дзяды | Dagotuvės<br>Velinės - Diedai |
| эсхаталогіі | Каляды | Kaledų šventė |

2. Карані афармлення пазнавальных складальнікаў—кодаў традыцыйнай культуры, якія зараз існуюць у імпліцытным выглядзе, месцяцца ў наступных этапах гісторыі Рэгіёну: яго касмаганічныя міфы здольны з'яўляцца *палеаеўрапейскімі* па паходжанню («птушка і яе касмаганічнае яйка»); антрапаганічныя і блізнячыя—*індаеўрапейскімі* («інцэст блізнятаў-першапродкаў»); эсхаталагічныя—змешанымі (*палеа-індаеўрапейскімі*) па паходжанню (матывы патопу ў мясцовых варыянтах «асноўнага міфа» індаеўрапейскай міфалогіі) /7, 62,66/.

3. У сімвалічным маркіраванні сумежных: сезоннасці (велікодныя гульні-'біткі' 'маляванкамі'-'margičai'; летнесонцаваротныя кветкі 'купалка'-'kupolės', калядныя гульні 'яшчур'-'jaskeras'); этапаў-ініцыяцый жыццёвага цыклу (табуіраванне тэмы народзінаў, руцяны вянок; 'намітка'-'nuomitas', заўчасная падрыхтоўка да ўласнага пахавання) адчувальны ўплыў акрэсленай Ул.Тапаровым тэтрады апаратараў міфапаэтычнай мадэлі свету (ўяўленняў пра *ўзнікненне-павелічэнне-памяншэнне-знікненне* як універсальныя этапы ўсіх працэсаў традыцыйнага космасу) /2,103; 4,46/.

4. Варыятыўныя ланцугі вобразаў кшталту: «вада—камень—кветка—зязюля», якія адсочаны ў велікодных загадках сумежжа, здольны мець тлумачэнне канцэптуальных матрыц (згодна Ул.Тапарова), з дапамогай якіх універсальна-сімвалічна апісваўся *касмалагічны парадак* яго міфапаэтычнай традыцыі: «касмалагічны цыкл, рэлігійна-філасофскія канцэпцыі і сам працэс пазнання». У іх задаецца набор апаратараў над першаэлементамі-класіфікатарамі мясцовай МС. Уяўленні пра тэтраду, якія пакінулі адбіткі ў традыцыйнай свядомасці, магчыма максімальна спрошчана дэфінаваць як «касмічны антрапамарфізм» /7,66/.

5. Відавочна, што нават пры неасэнсаваным захаванні толькі часткі эмпліцытных—*паводзінных* праяў культуры ў натуральным асяродку, які вымагае іх пэўную сістэмнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(вонкавыя прыкметы календара, сімволіка пазначэння жыццёвага цыкла), традыцыя дае рады захаванню глыбінных сэнсаў *пазнавальнай* культуры на імпліцытным узроўні. Гэта дазваляе рабіць высновы пра першапачатковую *арыентаванасць* Рэгіянальнай традыцыі *на самазахаванне* праз сувязь са структурнымі асновамі ўласнай сістэмы міфаў /2,103/.

6. У дакументальным адлюстраванні і ў «жывых» фрагментах нематэрыяльнай традыцыйнай культуры беларуска-літоўскага сумежжа па абодвы бакі мяжы назіраецца шэраг *паралеляў*. Гэта магчыма разглядаць як ускоснае пацвярджэнне перспектыўнасці метадычнай базы даследавання ва ўжытку да традыцыі. І як доказ тэзісу пра тое, што (згодна М.Говарда) «народы, вельмі блізкія паводле свайой культуры, могуць гаварыць на розных мовах» /1,3; 6,64/.



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ


*Артыкулы ў інфармацыйна-навуковым і навукова-метадычных часопісах.*

1. Калацэй В. Каляндарная і працоўная раннетрадыцыйная класіка песень Беларускага Паазер'я і Паўднёвай Аўкштайты // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей: нацыянальныя меншасці на Беларусі і ў свеце.-Брэст,1997.- № 2.-С.3-4.

2. Калацэй В. Традыцыйная вакальная культура беларусаў // Асновы мастацтва.- 1998.- № 2.-С.101-104.

3. Калацэй В. «Сонечны крыж» і вытокі каляндарнай абраднасці беларусаў // Вясна на Беларусі: Рэпертуарны зборнік. - Мінск : НЦТДіМ,1998.- С.6-13.

4. Калацэй В. Вялікдзень на Панямонні // Вясна на Беларусі: Рэпертуарны зборнік. - Мінск : НЦТДіМ,1998. - С.34-47.

*Тэзісы дакладаў на навуковых канферэнцыях.*

5. Калацэй В. Традыцыйная беларуская вакальная музыка: ступень і формы ўплыву на мастацкую творчасць дзетак і падлеткаў // Социокультурные и эстетические основы творчества детей и подростков: Материалы научно-практической конференции (29 июня 1998г., г.Минск) / Отв.ред. Яковлева Н.Н., Кондаленко Л.К. - Минск, 1998. - С.80-81.

6. Калацэй В. Пра этналагічны аспект вопыту вывучэння песеннай культуры Паўночнай Беларусі // Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі: Матэрыялы навуковай канферэнцыі аспірантаў (14 мая 1997 г., г.Мінск): У 2 ч.- Мінск: Беларускі універсітэт культуры, 1999.- Ч.2.-С.61-66.

7. Калацэй В. Да пытання протакультуры беларусаў // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў: Матэрыялы навуковай канферэнцыі аспірантаў (14 мая 1997 г., г.Мінск): У 2 ч. / Рэд. А.У.Пазнякоў і інш.- Мінск: Беларускі універсітэт культуры,2000.- Ч.2.-С.21-23.


Калацэй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЕ

**Калацэй Вячаслаў Віктаравіч. Традыцыйная культура беларуска-літоўскага сумежжа (структура пазнання і паводзін).**

Ключавыя словы: традыцыйная культура, сумежжа, міф, рытуал, мадэль свету, сімвал, код, фрэймы паводзін, камунікацыя, сацыялізацыя, інкультурацыя, сваяцтва.

Прааналізаваны складальнікі і сістэмная арганізацыя мадэлі свету носьбітаў традыцыйнай культуры беларуска-літоўскага сумежжа. Паходжанне мадэлі свету выведзена з сістэмы міфаў рэгіёну — фрагментарна-дыскрэтных этыялагічных апавядаў пра паходжанне сусвету, якія адлюстраваны у розных — вербальных і невербальных тэкстах культуры. Даказана, што сістэма міфаў, якая рэканструявана, здольна з'яўляцца поліэтнічнай, а значыць, поліхранічнай па паходжанню. Міфы беларуска-літоўскага сумежжа прапанавана разумець як схаваныя коды, якія ператвараюць заўважныя паводзінныя праявы традыцыйнай культуры ў сімвалы, якія магчыма зразумець. У якасці паводзінных праяў традыцыйнай культуры разгледжаны найбольш адметныя этнавызначальныя праявы камунікацыі, сацыялізацыі і інкультурацыі вясковых жыхароў сумежжа. Крыніцай асвятлення такіх праяў з'яўляліся этнаграфічныя і этнасацыялагічныя матэрыялы XIX-XX стст. і гістарычныя сведчанні. Прапанавана асэнсаванне семантыкі паводзінных праяў традыцыйнай культуры з дапамогай акрэсленых міфалагічных кодаў. На гэтай падставе рознай ступені паралелі ў пазнавальнай і паводзіннай культуры беларускай і літоўскай частак сумежжа набываюць статус варыятыўных наступстваў аднолькавага тэсматычнага (першапачаткова-сакральнага) пазнавальнага генезісу, які магчыма тлумачыць як аўтахтонна-міграцыйны па паходжанню.



## РЕЗЮМЕ

**Калацей Вячеслав Викторович. Традиционная культура белорусско-литовского пограничья (структура познания и поведения).**

Ключевые слова: традиционная культура, пограничье, миф, ритуал, модель мира, символ, код, фреймы поведения, коммуникация, социализация, инкультурация, родство.

Проанализированы составляющие и системная организация модели мира носителей традиционной культуры белорусско-литовского пограничья. Происхождение модели мира выведено из системы мифов региона — фрагментарно-дискретных рассказов про происхождение мира, отраженных в разных — вербальных и невербальных текстах культуры. Доказано, что реконструированная система мифов региона является поликультурной, а значит, полихронической по происхождению. Мифы белорусско-литовского пограничья предложено трактовать как скрытые коды, которые превращают видимые поведенческие проявления традиционной культуры в символы, которые можно понять. В качестве поведенческих проявлений традиционной культуры рассмотрены наиболее значимые этноопределяющие проявления коммуникации, социализации и инкультурации сельских жителей пограничья. Источником освещения таких проявлений являлись этнографические и этносоциологические материалы XIX-XX вв. и исторические свидетельства. Предложено осмысление семантики поведенческих проявлений традиционной культуры с помощью определенных мифологических кодов. На этой основе разной степени параллели в познавательной и поведенческой культуре белорусской и литовской частей пограничья получают статус вариативных следствий одинакового тесматического (первоначально-сакрального) познавательного генезиса, который можно трактовать как автохтонно-миграционный по происхождению.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

**Kalatsei Vyacheslav Victorovich. Traditional Culture of the Belarusian-Lithuanian Frontier Area (Structure of Cognition and Behaviour).**

Key words: traditional culture, frontier area, myth, ritual, world model, symbol, code, frames of behaviour, communication, socialization, enculturation, kinship.

There have been analysed the components and the world model systematic organization of the native people in the Belarusian-Lithuanian frontier area. World model is deeply rooted into the regional mythical system of fragmentary discrete tales about the origin of world: these tales have been reflected both in verbal and non-verbal cultural forms. Our research has proved that the reconstructed regional mythical system is polyethnic and consequently polychronic by origin. It has been proposed that myths of the Belarusian-Lithuanian frontier area should be treated like concealed codes which convert the visible manifestations of traditional culture into intelligible symbols In the capacity of the behaviour displays of traditional culture we have considered the most significant ethnic communicative characteristics, socialization and enculturation of the frontier rural inhabitants. The source of these displays is the ethnographical, ethnosociological materials of the XIX-XX cent. and historical evidence. There has been worked out a sensible semantical interpretation of traditional behaviour culture with the help of mythical codes. As a result, parallels of various degrees in the cognitive and behaviour culture on the Belarusian and Lithuanian frontier sides achieve the variable consequences status of an identical thesmatic (primary-sacred) genesis. This genesis may be regarded as local-migratory by origin.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Калацэй Вячаслаў Віктаравіч**

**ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАГА СУМЕЖЖА (СТРУКТУРА ПАЗНАННЯ І ПАВОДЗІН)**

**24.00.01 – тэорыя культуры**

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі


---

Падп.да друку 27.06.2000. Фармат 60x84 1\16. Папера пісчая № 2.
Ум.друк.арк.1,28. Ул.-выд.арк.1,15. Заказ № 173 Тыраж 100 экз.

---

Рызограф Беларускага універсітэта культуры
220001, г.Мінск, вул Рабкораўская,17